Орган Бешанковіцкага РК КП(б)Б і Райсовета Дэпутатаў Працоўных

Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# СТАЛІНЕЦ

73

панядзелак, 5 сакавіка 1945 года

цана 15 кап.

## За далейшы ўздым сельскай гаспадаркі

Вялікая Айчынная вайна працягваецца ўжо амаль чатыры гады. Чырвоная Армія выгнала „хваленыя" нямецкія войскі з нашай тэрыторыі і зараз наносіць небывалыя па сіле ўдары ворагу на яго тэрыторыі і гэтым самым давяршае разгром фашысцкага логава.

Калгасы нашага раёна ў цяжкіх умовах вайны, арганізавана правялі ўборку ураджая. У сціслыя тэрміны разлічыліся з дзяржаўнымі пастаўкамі за 1944 г.

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) у сваёй пастанове аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 г. адзначаюць вялікі патрыятычны ўздым калгаснікаў у аказанні дапамогі Чырвонай Арміі ў канчатковым разгроме ворага. Гэта дапамога заключалася ў тым, што большасць калгаснікаў здала ў фонд Галоўнага Камандавання Чырвонай Арміі вялікую колькасць хлеба і другіх прадуктаў звыш плана. Калгаснікі нашага раёна ўнеслі ў гэты фонд 9333 пуды хлеба.

„Савет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) лічаць галоўнай задачай калгасаў, МТС, соўгасаў, зямельных органаў, партыйных і савецкіх арганізацый у 1945 годзе ўсямернае павышэнне ураджайнасці і павелічэнне валавых збораў збожжа і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў".

Гэта задача вялікая. Нямецка-фашысцкія акупанты разбурылі пасеўныя плошчы. Нам неабходна ў тэрмін засеяць добраякасным насеннем, каб атрымаць ураджай даваеннага часу. Трэба прыкласці ўсе сілы да таго, каб у гэтым годзе засеяць пасяўную плошчу размерам даваеннага ўзроўня. Адрамантаваць усе сельскагаспадарчыя машыны. Неабходна ва ўсіх калгасах навесці належны парадак. Арганізаваць штодзённую дапамогу калгасам. Соўнаркам СССР і ЦК ВКП(б) у сваім гістарычным дакуменце ўказваюць шляхі ажыццяўлення гэтых вялікіх задач. Гэты дакумент павінен быць даведзен да ведама кожнага калгасніка і калгасніцы. У ходзе абмеркавання ўказанняў СНК СССР і ЦК ВКП(б) трэба выпрацаваць практычныя мерапрыемствы па ажыццяўленню задач у кожным сельсовеце, калгасе, МТС, вёсцы.

Да веснавой сяўбы засталіся лічаныя дні. За гэты час неабходна поўнасцю засыпаць і ачысціць насенне, адрамантаваць інвентар, вывесці гной, выпрацаваць вытворчы план. Дадзім як мага больш хлеба нашай Радзіме.

## Ад Савецкага Інформбюро

### (З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 3 САКАВІКА)

Войскі 2-га беларускага фронта, прадаўжаючы наступленне, 3 сакавіка з боем авалодалі гарадамі Руммэльсбург і Польнаў—важнымі вузламі камунікацый і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў у Памераніі, а таксама з баямі занялі больш 80 населеных пунктаў.

На тэрыторыі Чэхаславакіі на паўночны-захад і на захад ад горада Лучэнец нашы войскі з баямі занялі рад населеных пунктаў.

На другіх участках фронта—баі мясцовага значэння і пошукі разведчыкаў.

За 2 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 39 нямецкіх танкаў.

## Па Савецкаму Саюзу

Для таго, каб поўнасцю засеяць яравы клін у сельгасарцелі імені Варашылава, Саратаўскай вобласці, не хапала насення пшаніцы і бульбы. Калгасныя актывісты Міронаў, Абідзена і другія пазычылі сваей арцелі па 6-7 пудоў збожжа і бульбы. Следуючы іх прыкладу, выдзелілі з сваіх запасаў па некалькі пудоў збожжа і другія калгаснікі. Такім чынам калгасны насенны фонд быў хутка папоўнен.

* * *

Калінінская вобласць здаўна славіцца высокімі ураджаямі ільну. Зараз тут адраджаецца гатунковае ільнаводства. Усходнія раёны — Бежыцкі, Красна-Холмскі — выдзелілі насенне для вызваленых ад нямецкіх акупантаў абласцей. Вялікая партыя насення накіроўваецца ў паўночныя раёны краіны.

* * *

У Крыму шырока разгарнулася падрыхтоўка брыгадзіраў, звенявых калгасаў і механізатарскіх кадраў. У паўднёвых і прадгорных раёнах закончылі вучобу на курсах больш 3-х тысяч калгаснікаў — вінаградараў, садаводаў і табакаводаў. Прайшлі падрыхтоўку сотні жывёлаводаў. У бліжэйшыя дні заканчваюць вучобу трактарысты.

# Насустрач веснавой сяўбы

## Своечасова рыхтуемся да веснавой сяўбы

Шырока разгарнулася работа па рамонту трактароў у Бешанковіцкай МТС. Адрамантавана 5 трактароў. Днямі заканчываецца рамонт шостага трактара. Старанна рамантуюць трактары слесары т. т. Прышчэпаў і Шутаў, якія штодзённа выконваюць нормы выпрацоўкі на 160—180 процантаў.

У адказ на загад Вялікага Сталіна трактарысты Бешанковіцкай МТС узялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Т. Чорнамордаў абавязаўся на 15-ці сільным трактары за сезон 1945 г. узараць 1350 га, т. Гайлаў—1300 га і т. Шут П. К.—1200 га.

Веснавую сяўбу 1945 г. наша МТС сустрэне падрыхтавана.

Ассеў — дырэктар МТС.

## ГАТОВЫ ДА СЕВА

Старанна падрыхтаваліся калгаснікі і калгасніцы калгаса 1-га мая Стрэлішчанскага сельсовета да веснавой сяўбы. Падрыхтавана і адрамантавана 20 плугоў, 5 параконных, 26 барон звіта 23 абрэці і 46 вожжаў.

Вялікая увага звернута на збор угнаення. Сабрана да 10 цэнтнераў залы і курынага памёту. Насеннем калгас поўнасцю забяспечан. Заканчваецца абмен культур з другімі калгасамі.

Абляцоў — старшыня калгаса 1 мая.

## Зацягваюць падрыхтоўку

Дрэнна ідзе падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў калгасе „Калініна“ Пяцігарскага сельсовета.

У калгасе налічваецца 6 коней, трое з іх хворыя коростай, а трое астатніх ніжэй сярэдняй упітанасці і да палявых работ непрыгодны.

Сельгасінвентар не рамантуецца. Угнаенне калгаснікі не збіраюць і не вывозяць на поле.

Праўленне калгаса (на чале з старшынём калгаса т. Шчупачонкам) зацягваюць гэта важнае мерапрыемства, а сельсовет (старшыня т. Апенка) патурае такой бестурботнасці.

Ведаючы.

## У нямецкім замку

У адным з раёнаў Усходняй Прусіі гвардзейцы падпалкоўніка Пятрова без адзінага выстралу занялі старажытны замак „Фалькенхорст“. У замку нікога не аказалася. Між тым ва ўсіх залах гарэла электрычнасць. Усюды стаяла мноства вялікіх, часткова ўжо упакаваных чамаданаў. На падлозе і сталах валяліся футляры з пад каштоўнасцей. Мяркуючы па ўсяму, жыхары замка выбраліся адсюль зусім нядаўна, магчыма з гадзіну.

У замку засталося яшчэ шмат дабра. Тут нашы байцы знайшлі французскі фарфор, бельгійскія кружавы, мэбля польскіх князей, каўры, вывезеныя з Расіі, італьянскія вазы, нарвежскія лыжы. У адным з пакояў вісела карціна савецкага мастака Герасімава, украдзеная, мяркуючы па штампу на адвароце карціны, у горадзе Пушкіне. Нават сталовая бялізна ў замку аказалася з вышытымі шоўкам меткамі, нічога агульнага не маючымі з прозвішчам уладальніка замка Фонштамма.

У замак як у грабежніцкую „маліну“ сцякалася нарабаванае дабро з усіх канцоў Еўропы. Нарабаванае дабро ў замак прывозіў сын яго ўладальніка, капітан германскага паветранага флота.

## За граніцай

У Германіі войскі саюзнікаў прадаўжаюць прасоўвацца у раёне горада Прум. Часці саюзнікаў уступілі ў Керфенхэйм і занялі Мюнхэн-Гладбах.

Немцы аказваюць упорнае супраціўленне на ўсходзе ад ракі Эрфт, а таксама на ўсходнім беразе ракі Рур.

Саюзнікі ўступілі ў горад Трыр.

Днём 1-га сакавіка звыш 1200 цяжкіх амерыканскіх бамбардыроўшчыкаў атакавалі германскія чыгуначныя цэнтры.

Звыш 600 амерыканскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на германскі горад Мангейм і на завод штучнага гаручага бліз Дортмунда ў Германіі.

У ноч на 1 сакавіка англійскія самалёты бамбардыравалі Берлін, Нюрнбэрг і Мюнхэн.

Як паведамляе парыжскае радыё французскі суд прыняў рашэнне аб канфіскацыі маёмасці якая належала маршалу Петэну, Лавалю і іншым членам былога французскага ўрада, прадаўшагася Гітлеру.

Як цяпер стала вядома, 28-га лютага ў Капенгагене адбылася ўзброеная сутычка паміж дацкімі патрыётамі і членамі арганізацыі дацкіх фашыстаў. У перастрэлцы былі забіты 2 і цяжка ранена 5 гітлераўскіх наймітаў. Фашысцкая паліцыя цяжка раніла адну датчанку і 2-х падлеткаў.

Адк. рэдак. С. Н. Саўрыцкі.

Адрас рэдакцыі: г. п. Бешанковічы, Валадарская вул. 4. Тыраж 1100 экз.